ных эмоциональных типов, анализировались причины их эмоционального неблагополучия, поведение военнослужащих в различных жизненных ситуациях.

В ходе эксперимента велся поиск методов и способов работы офицера по развитию у личного состава способности видеть и понимать состояние эмоционального неблагополучия товарищей по службе, адекватно действовать в этих ситуациях; подбирались упражнения и давались задания, советы и рекомендации для индивидуального решения военнослужащими, которые испытывают состояние неблагополучия и имеют проблемы личностного характера; отбирались тренинги и упражнения для проведения с отдельными военнослужащими и группами пограничников по преодолению состояний неблагополучия.

Данные показатели офицеру целесообразно учитывать при составлении общей характеристики личного состава (по критериям эмоционального типа) и могут быть положены в основу работы по профилактике и коррекции состояний эмоционального неблагополучия военнослужащих.

ЛИТЕРАТУРА

1. Андриенко, Е.В. Социальная психология: Учеб. Пособие для студ. высш. пед. учеб. Заведений / Под ред. В.А. Сластенина. – 2-е изд., доп. – М.: Издательский центр «Академия», 2003. – 264 с.

2. Ильин, Е.П. Эмоции и чувства. – СПб: Питер.- 2001.-752с.: Ил. – (серия «Мастера психологии»).

УДК 769.91: 325.254.4 “1914/1916”

Кульмінская Г. Ю., Дрынеўская К. М.

# МАРАЛЬНА-ПСІХАЛАГІЧНАЕ ЎЗДЗЕЯННЕ НАГЛЯДНАЙ АГІТАЦЫІ Ў ДАБРАЧЫННЫХ КАМПАНІЯХ НА КАРЫСЦЬ БЕЖАНЦАЎ БЕЛАРУСІ (1914–1916 гг.)

*Беларускі дзяржауны тэхналагічны універсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік канд. гістарычных навук* ***Рыжанкоў І. М.***

*The article dwells upon the problem of moral and psychological influence of evidentpropaganda in the charitable companies on advantage of refugees of Belarus (1914–1916) is covered.*

З 1914 г. Расійская імперыя, яшчэ не памацнеўшая пасля паражэння ў руска-японскай вайне і хваляванняў рэвалюцыі 1905–1907 г.г., зноў апынулася перад выпрабаваннямі. Маніфесты Мікалая II аб разгортванні вайны з Германіяй і Аўстрыяй адчынялі новую старонку ў гісторыі краіны — гісторыю ваенных перамог і паражэнняў, разарэння народных мас, ліквідацыі самадзяржаўя і ўсталявання новага дзяржаўнага ладу. Мабілізацыя, мілітарызацыя эканомікі і іншыя акалічнасці ваеннага часу патрабавалі ад урада значных намаганняў па фарміраванню грамадскай падтрымкі. Разам з

патрыятычнымі мітынгамі, шэсцямі, малебнамі з нагоды “Другой Айчыннай вайны”, вялікую ролю ва ўзмацненні патрыятычных настрояў грамадства адыгрывалі сродкі масавай інфармацыі: газеты, лістоўкі, агітплакаты і інш. З набліжэннем фронту да беларускіх зямель, першымі ахвярамі вайны сталі тутэйшыя жыхары, якія сталі бежанцамі. Ва ўмовах гвалтоўнай эвакуацыі амаль 2 млн. чалавек пакінулі родныя мясціны, гаспадарку. Бежанцы апынуліся ў наздвычай складаным становішчы — адсутнасць харчавання і жылля. У прыватнасці, на станцыі Мінск у кастрычніку 1915 г. пад адкрытым небам знаходзілася 13 000 і за некалькі дзён, тут было пахавана 1516 чалавек [1, с. 60]. Менавіта таму, да гэтай нялёгкай справы царскі ўрад вырашыў прыцягнуць грамадскія, дабрачынныя і нацыянальныя ўстановы. У выніку, да 1916 г. дзейнічала 1300 арганізацый і таварыстваў па аказанні дапамогі бежанцам. Першасныя пазіцыі ў дабрачынных кампаніях займалі Усерасійскі Земскі Саюз, Усерасійскі Саюз Гарадоў і Таццянінскі камітэт [2, с. 145]. Сродкі, сабраныя дабрачыннымі арганізацыямі, у 1914–1916 гг. аказалі пэўную падтрымку бежанцам. Так, да мая 1916 г. аддзяленнямі Таццянінскага Камітэта Магілёўшчыны была аказана грашовая падтрымка ў памеры 169 254 руб.

Важная роля ў справе актывізацыі дабрачынных акцый на карысць ахвяр вайны належыла плакатам. Умоўна іх можна падзяліць на тры плыні.



1. Плакат-алегорыя. У такіх плакатах мастакі звярталіся да рускай міфалогіі з яе славутымі героямі. Мастак В. Васнецоў увасобіў ідэю патрыятызму ў фальклорным вобразе асілка з мячом: асілак змагаецца з шматгаловым драконам, які абвівае яго моцнымі кольцамі цела і крылляў. Малюнак упрыгожаны дэкаратыўнымі элементамі. Тэкст плаката паведамляе — “В залах Российского благородного собрания 5, 6, 7 декабря 1914 г. — благотворительный базар “На помощь жертвам войны” і знаёміць з праграмай базара [3, с. 5].




2. Плакат-рэалія. На гэтых плакатах раскрывалася рэальная карціна выпрабаванняў, якія выпалі на долю ахвярам вайны. Прыкладам гэтага напрамку плаката з’яўляліся плакаты “Помогите беженцам” (аўтар невядомы), “На продовольственную помощь малоимущим” (Г. Аляксеева). На першым плакаце – жанчыны і дзяцей, прагнаныя з роднай зямлі, якія спрабуюць знайсці жыллё, ежу. На другім — замалёўка сталовай; гэта сцэнка паказвае трагедыю вайны – сабраных за адзіным сталом галодных і бяздомных дзетак, жанчын, старых, інвалідаў. Вядомая праца Л. Пастэрнака “На помощь жертвам вайны” (1914 г.) расказвае пра салдата. Мастак бачыць у ім не храбрэца, які люта знішчае ворага, а ў першую чаргу чалавека, стомленнага ад цяжкай працы і маральнай адказнасці за пралітую кроў. Невыпадкова ў бок адстаўлена вінтоўка, бяссільна апушчана галава [3, с. 6–7].



3. Плакат-афіша. Мастацкая афіша выконвала інфармацыйную задачу аб планах правядзення выстаў, канцэртаў, вербнага базару, латарэі па збору сродкаў на карысць пацярпелых ад вайны. У названых афішах акцэнт рабіўся на святочным, забаўляльным характару мерапрыемстваў. Разам з тым, асноўным элементам уздзеяння такога плаката з'яўлялася тэкставая інфармацыя.

Кожны тып плакатаў адрозніваўся лаканізмам і ёмістасцю выяўленчай сімволікі, каляровым рытмам, графічнай мовай, ступеню эмацыянальнага ўплыву. Але ўсе яны мусілі згуртаваць грамадства на ідэйнай плыні пераможнага заканчэння вайны, а з ёю і вырашэння бежанскіх праблем. Безумоўна, што наглядная агітацыя гадоў Першай сусветнай вайны звярталася да эмацыянальнай сферы людзей, імкнулася выклікаць пачуцці чуласці, міласэрнасці і спрыяла дабрачынным кампаніям.

## ЛІТАРАТУРА


1. Мікалаевіч А. Н. Бежанцы: У першую сусветную вайну // Беларуская мінуўшчына. — 1994. — № 3.
2. Лапановіч С. Ф. Дзейнасць дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні: Зб. навук. пр. — Мн.: БДПУ, 2002.
3. Бабурина Н. И. Русский плакат Первой мировой войны.— М.: «Искусство и культура». — 1992. — 120 с.


УДК 159.9

Латушко Ю. Г.

# ЛОКУС КОНТРОЛЯ ШКОЛЬНИКОВ СРЕДНЕГО ВОЗРАСТА И ЕГО ВЗАИМОСВЯЗЬ С УРОВНЕМ ШКОЛЬНОЙ ТРЕВОЖНОСТИ

*Белорусский национальный технический университет,*
*г. Минск, Республика Беларусь*

*Научный руководитель преподаватель* ***Каминская Т.С.***

Одной из важнейших проблем современных психологических исследований являются изучение проблемы школьной тревожности и локализации контроля над значимыми для человека событиями.

Согласно Дж. Роттеру, одним из элементов знания о себе выступает гипотеза людей об источнике успехов и неудач, как положительных, так и отрицательных результатов. Дж. Роттер предложил различать между собой лю-